

**Вяртанне гістарычных каштоўнасцяў з замежжа.**

*БСДП выступае за актывізацыю працы камісіі па пошуку і вяртанні гісторыка-культурнай спадчыны, якая ў сілу розных акалічнасцяў апынулася за межамі краіны, аднак звязаная з тэрыторыяй краіны і належыць беларускаму народу. БСДП за вяртанне вывезеных з Беларусі архіваў.*

# Вяртанне нашых каштоўнасцяў, вы Беларусі, — надзё новай беларускай

РЭПАЗІТОРЫЙ БДУКІ

Пасля абвяшчэння Беларуссю незалежнасці ўзнікла пытанне аб вяртанні ў краіну гістарычных і культурных каштоўнасцяў, вывезеных на працягу стагоддзяў за яе межы.

Пры гэтым неабходна было прытрымлівацца міжнародных канвенцый і рэзалюцый ААН і адпаведных нормаў міжнароднага права. У міжнародным праве існуе спецыяльны тэрмін "рэстытуцыя", які прадугледжвае вяртанне маёмасці, неправамерна захопленай і вывезенай адным з ваюючых бакоў з тэрыторыі другой дзяржавы, якая з'яўлялася яго ваенным праціўнікам. Першыя праявы рэстытуцыі адбыліся ў XIX ст. Потым з'явіліся гаагскае палажэнне аб законах і звычаях сухапутнай вайны 1907 г. і Пратакол Гаагскай Канвенцыі 1954 г. аб рэстытуцыі. Пры гэтым можна кіравацца канвенцыяй аб мерах, накіраваных на забарону і папярэджанне незаконнага ўвозу, вывазу і перадачы права ўласнасці на культурныя каштоўнасці, прынятую ў 1970 г. Генеральнай канвенцыяй ЮНЕСКА (рэзалюцыя 3391(XXX) і 32 (18).

**Найбольш наша спадчына пацярпела ў часы другой сусветнай вайны. Толькі кніжных фондаў мы страцілі 95% ад усёй колькасці да пачатку вайны.**

Таму наша краіна можа і павінна прапанаваць дзяржавам, у якіх цяпер знаходзяцца нашыя культурныя



**Алег ТРУСАЎ,**
сябра ЦК БСДП,
кандыдат
гістарычных навук

# гістарычных везеных за межы нная задача улады



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ



ФОТА • rebenok.by • wdl.org

каштоўнасці, вывезеныя ў розныя часы і па розных прычынах, разгледзець два пытанні:

- ✓ Юрыдычную правамернасць знаходжання на іх тэрыторыі культурных каштоўнасцяў, якія паходзяць з Беларусі;
- ✓ Метады і парадак перадачы, у тым ліку і ўзаемнай, законным уласнікам тых каштоўнасцяў, якія памылкова або па іншых прычынах трапілі на тэрыторыі іншых дзяржаў.

**Найбольш нашых каштоўнасцяў трапіла ў Расію, Германію і Польшчу. Ёсць яны ў Літве, Украіне і некаторых іншых краінах.**

У часы існавання СССР шмат беларускіх каштоўнасцяў і асабліва вырабаў з каштоўных металаў вывозілі ў Маскву ці Ленінград, і іншыя гарады Расіі. Пасля распаду СССР у 1992 г. кіраўнікі краін СНД падпісалі ў Мінску пагадненне аб вяртанні гістарычных каштоўнасцяў дзяржавам іх паходжання. У ім было прадугледжана стварэнне міжурадавай камісіі, а таксама нацыянальных камісій, каб скласці спісы і зрабіць апісанне вывезеных каштоўнасцяў.

Аднак Урад Расіі выступіў па прапанове расійскіх навукоўцаў і палітыкаў на чале з акадэмікам Дзмітрыем Ліхачовым супраць гэтага пагаднення і дамогся яго скасавання расійскім парламентам.










РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У 1997 г. Дзяржаўная Дума Расіі падрыхтавала і прыняла Закон аб рэстытуцыях, паводле якога Расія нічога вяртаць іншым краінам не збіраецца.

Беларускі Урад пасля 1994 г., калі была створана "саюзная дзяржава", не спяшаўся вяртаць нашыя каштоўнасці дадому. Доўгі час гэтым займалася грамадская камісія "Вяртанне" пры грамадскім аб'яднанні "Беларускі фонд культуры" на чале з Адамам Мальдзісам. Гэтую тэму неаднаразова падымалі ў сваіх публікацыях пісьменнік і гісторык Уладзімір Арлоў, гісторык-архівіст Віталь Скалабан. Пад ціскам грамадскасці праблему рэстытуцыі гісторыка-культурных каштоўнасцяў разглядаць на дзяржаўным узроўні прапанавала Міністэрства культуры Беларусі. У 2006 г. на прэс-канферэнцыі ў Мінску намеснік міністра культуры Уладзімір Грыдзюшка паведаміў, што ў гады Другой сусветнай вайны з Беларусі было вывезена больш за 11,5 тысяч музейных экспанатаў. Сярод іх 48 слуцкіх паясоў, 170 твораў жывапісу. Самая галоўная страта — крыж Еўфрасінні По-

лацкай. Ён адзначыў, што ў музеях Масквы, Разані і Пскова захоўваюцца рэчавыя, выяўленчыя і пісьмовыя рэліквіі з беларускіх музеяў і бібліятэк, што былі вывезены ў гады Вялікай Айчыннай вайны (Народная Воля, № 37-38 ад 03.2006 г.). Тады, у 2006 г. стварылі міжведамасную рабочую групу па рэстытуцыі культурных каштоўнасцяў. Планавалася падключыць да працы спецыялістаў Міністэрства культуры, Беларускага дзяржаўнага інстытута праблем культуры, музейных супрацоўнікаў і студэнтаў гістфака БДУ. Але хутка гэта дзейнасць была згорнута без асаблівых вынікаў.

Аднак жыццё не стаіць на месцы, і нарэшце ў адпаведнасці з Пастановай Савета Міністраў Беларусі № 25 ад 13.01.2017 г. была створана Камісія пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь па выяўленні, вяртанні, сумесным выкарыстанні і ўключэнні ў навуковы і культурны ўжытак культурных каштоўнасцяў, якія знаходзяцца за межамі Рэспублікі Беларусь. Сустаршынямі камісіі былі прызначаны намеснік Міністра замежных спраў Валянцін Рыбакоў і намеснік Міністра культуры Аляксандр Яцко. У склад камісіі ўвайшлі Уладзімір Гілеп, Аляксандр Карлюкевіч, Аляксандр Лакотка, Адам Мальдзіс, Вадзім Пісарэвіч, Юрый Селіверстаў і Дзмітрый Яцэвіч.

Прайшло некалькі гадоў, але аб працы гэтай камісіі мы нічога не ведаем і вялікіх зрухаў у вяртанні нашых каштоўнасцяў няма.

Таму пакуль можна спадзявацца на дзейнасць асобных навуковых ці культурных устаноў, краязнаўцаў і беларускіх патрыётаў. У якасці прыкладу можна прывесці працу музея горада Магілёва, які здолеў выкупіць некалькі ўнікальных беларускіх рарытэтаў за мяжой, альбо дзейнасць архітэктара-рэстаўратара Вадзіма Глінніка і яго жонкі гісторыка мастацтва Ядвігі Лукашык. Яны здолелі выкупіць на розных аўкцыёнах каля сотні фотаздымкаў помнікаў Беларусі, зробленых у часы Першай Сусветнай Вайны нямецкім фатографам Фрыцам Краўскопфам.

На нашу думку, урадавая Камісія па рэстытуцыі павінна мець свой бюджэт і свой навуковы штат супрацоўнікаў, якія абавязаны працаваць сумесна з грамадскасцю і рабіць штогадовую справаздачу аб сваёй дзейнасці. ■



**У гады Другой сусветнай вайны з Беларусі было вывезена больш за 11,5 тысяч музейных экспанатаў. Сярод іх 48 слуцкіх паясоў, 170 твораў жывапісу. Самая галоўная страта — крыж Еўфрасінні Полацкай. Ён адзначыў, што ў музеях Масквы, Разані і Пскова захоўваюцца рэчавыя, выяўленчыя і пісьмовыя рэліквіі з беларускіх музеяў і бібліятэк, што былі вывезены ў гады Вялікай Айчыннай вайны.**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ